Новы час

21.02.2019

# Супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сталі мадэлямі Mark Formelle

21 лютага Mark Formelle прэзентаваў лімітаваную калекцыю шкарпэтак #МоваГэтаСтылёва. Такі падарунак для беларусаў брэнд падрыхтаваў да Міжнароднага дня роднай мовы, які сёння адзначаецца ў 20-ы раз. Першымі з калекцыяй пазнаёміліся супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.







Міжнародны дзень роднай мовы, абвешчаны ЮНЕСКА, першы раз адзначылі ў 2000 годзе. Спецыяльна да юбілею такога свята Mark Formelle выпусціў калекцыю шкарпэтак #МоваГэтаСтылёва і паказаў у ёй тыя асаблівасці беларускай мовы, якія ўсе жыхары нашай краіны ведаюць яшчэ са школы: «Жы» і «Шы», «Дж» і «Дз», «Ў» і «І».

— *Сёння яркія і незвычайныя шкарпэткі носяць амаль усе: і айцішнікі, і офісныя работнікі, і прадстаўнікі творчых прафесій. Гэты элемент гардэроба дазваляе «вылучыцца з натоўпу» і быць стыльным ў любым вобразе,* — распавядае **Наталля Суворава**, кіраўнік аддзела маркетынгу брэнда Mark Formelle. — *Мы выпусцілі калекцыю #МоваГэтаСтылёва спецыяльна для тых беларусаў, якія любяць і модную вопратку, і родную мову, незалежна ад таго, размаўляюць на ёй у паўсядзённым жыцці ці не.*





Здымка лукбука калекцыі прайшла ў нестандартным для моднага адзення фармаце. Замест арт-прастор і подыумаў — чытальныя залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. А на месцы прафесійных мадэлей — супрацоўнікі галоўнай бібліятэкі краіны.


У БЕЛАРУСІ ЗНОЎ
ДАЖДЖЫ




Д Ж


НА МОВЕ
А КАЛІ









*З Міжнародным днём*
*роднай мовы!*

*— Мы заўсёды шукаем новыя і неардынарныя шляхі папулярызацыі роднай мовы, таму з задавальненнем прынялі ўдзел у праекце #МоваГэтаСтылёва,* — распавядае начальнік сацыякультурнага цэнтра Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Радміла Букач**. — *У бібліятэцы можна пазнаёміцца з дакументамі, якія дазваляюць прасачыць развіццё беларускай мовы, таму што ў нашых фондах захоўваюцца 10 выпускаў Бібліі Францыска Скарыны, датаваныя 1517-1519 гадамі, рукапіс сатырычнай «Прамовы Мялешкі» XVII ст., адзінае прыжыццёвае выданне Максіма Багдановіча «Вянок» з аўтографам аўтара і найноўшыя кнігі нашых сучаснікаў.*






Шкарпэткі з калекцыі #МоваГэтаСтылёва ўжо можна знайсці ў фірмовых крамах Mark Formelle. Але ўсім жадаючым варта паспяшацца, паколькі калекцыя лімітаваная — усяго 1 пара на кожныя 700 беларусаў.